Ambasada Rzeczypospolitej Polskiej w Republice Białoruś
Пасольства Польшчы ў Рэспубліцы Беларусь

Stowarzyszenie Archiwistów Polskich
Аб'яднанне польскіх архівістаў

# Polska–Białoruś. Wspólne dziedzictwo historyczne

Powstanie styczniowe
w tradycji i myśli politycznej Polski i Białorusi

# Польшча–Беларусь. Агульная гістарычная спадчына

Студзеньскае паўстанне
ў традыцыі і палітычнай думцы Польшчы і Беларусі

---

Zbiór prac naukowych pod redakcją
Зборнік навуковых прац пад рэдакцыяй

Ewy Rosowskiej i Aleksandra Wabiszczewicza
Евы Расоўскай і Аляксандра Вабішчэвіча

---

Warszawa 2014
Варшава 2014

АЛЯКСАНДР ВАБІШЧЭВІЧ

# Дакументальныя матэрыялы 1920–30-х гадоў з фондаў Дзяржаўнага Архіва Брэсцкай Вобласці аб ушанаванні памяці ўдзельнікаў паўстанняў 1830–1831 і 1863–1864 гг. на Палессі

У фондах Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці захоўваецца шэраг дакументальных матэрыялаў, прысвечаных ушанаванню памяці ўдзельнікаў Лістападаўскага (1830–1831 гг.) і Студзеньскага (1863–1864 гг.) паўстанняў на тэрыторыі Палескага ваяводства ў міжваенны час. Паспрабуем прааналізаваць некаторыя з іх.

Восенню 1930 г. да 100-годдзя Лістападаўскага паўстання па ўсёй тэрыторыі Польшчы (і ў заходнебеларускім краі таксама) адбываліся ўрачыстыя мерапрыемствы. У прыватнасці, у Брэсце святкаванні каардынаваў асобны грамадскі гарадскі камітэт. Магістрат Брэста звярнуўся 27 лістапада 1930 г. да мясцовых жыхароў з заклікам прыняць актыўны ўдзел у мерапрыемствах і ўпрыгожыць дамы польскімі дзяржаўнымі сцягамі. Вечарам на наступны дзень (28 лістапада 1930 г.) адбылося шэсце ваенных і школьных аркестраў па вуліцах горада[1].

Асноўныя ўрачыстыя мерапрыемствы да 100-годдзя Лістападаўскага паўстання праходзілі ў Брэсце 29 лістапада 1930 г. Зранку былі наладжаны як у каталіцкіх храмах (парафіяльным касцёле Узвіжання Святога Крыжа, гарнізонным касцёле Святога Казіміра на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці, які быў перабудаваны ў 1926 г. з праваслаўнай царквы), так і ў вялікай сінагозе жалобныя набажэнствы па загінуўшых паўстанцах 1830–1831 гг. А вечарам таго ж дня былі праведзены 2 святочныя мерапрыемствы: у польскай гімназіі імя Р. Траўгута – урачыстае пасяджэнне („акадэмія”) з канцэртам, падрыхтаваным Брэсцкім музычным таварыствам, а ў Брэсцкай крэпасці – урачысты вечар, арганізаваны афіцэрскім клубам („ogniskiem”) у Белым палацы і ў Доме салдата. У гімназіі ў час „акадэміі” у ганаровай варце стаялі члены Стралецкага саюза. У праграме „акадэміі” былі выступленні сімфанічнага аркестра (дырыжор – маёр

[1] Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Ф. 5. – Воп. 1. – Спр. 685. – Арк. 6.

В. Зыгмунтовіч) з выкананнем польскага гімна, „Варшавянкі", а таксама „Менуэта" І. Падэрэўскага, „Легенды" Г. Веняўскага і інш. Камерны хор выконваў эцюд Ф. Шапэна і іншыя творы. Канцэртную праграму упрыгожыла сола Ізабэлы Адамскай[2].

А 30 лістапада 1930 г. у клубе („ognisku") чыгуначнікаў г. Брэста было праведзена ўрачыстае пасяджэнне („акадэмія"), у рамках якога былі гісторыка-краязнаўчыя выступленні Р. Гарашкевіча і Ст. Завадскага, паказ п'есы Л. Рыдля „Вяртанне з Сібіры", падрыхтаванай уласнай тэатральнай трупай. Была ўстаноўлена плата за прадстаўленне (ад 0,5 да 2 злотых). Атрыманы прыбытак ад „акадэміі" быў прызначаны для будаўніцтва помніка загінуўшым паўстанцам каля в. Невель Пінскага павета[3]. Менавіта там 8 жніўня 1831 г. быў разбіты царскімі войскамі паўстанцкі атрад на чале з Цітам Пуслоўскім. Сам Ц. Пуслоўскі быў паранены, адышоў праз Валынскую губерню ў Галіцыю, адкуль падаўся ў эміграцыю[4].

Актыўны ўдзел у мемарыялізацыі падзей Лістападаўскага (як і Студзеньскага) паўстання выконвалі польскія вайсковыя фарміраванні. Напрыклад, цэлы шэраг мерапрыемстваў да чарговай гадавіны Лістападаўскага паўстання быў праведзены вайскоўцамі ў пачатку снежня 1932 г. у г. Пінску. Праграма ўключала ўрачыстае шэсце 84-га палка палескіх стралкоў і Пінскай рачной флатыліі ў суправаджэнні аркестраў па вуліцах горада, жалобнае набажэнства ў гарнізонным касцёле, вайсковы парад, правядзенне афіцэрскага сходу[5].

У канцы 1920-х гг. была разгорнута агульнапольская акцыя па добраўпарадкаванні пахаванняў загінуўшых у час войн і паўстанняў. Захады па ўшанаванні барацьбітоў за незалежнасць адроджанай Польшчы набывалі яскравы прапагандысцкі характар. Напрыклад, у адказ на просьбу Галоўнай управы Польскага таварыства апекі за магіламі герояў міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы ў Варшаве выдала 30 студзеня 1933 г. для ўсіх школьных акруг асобны цыркуляр адносна заахвочвання вучнёўскай моладзі „да ўтрымання ў парадку магіл польскіх салдат і іх аздаблення, асабліва ва ўрачыстыя дні (гадавіна атрымання незалежнасці Польшчы, народны абход, Задушны дзень (Дзяды) і інш.)". Як адзначалася ў дакуменце, галоўнай мэтай было імкненне да фарміравання ў школьнікаў „культу барацьбітоў за незалежнасць"[6].

---

[2] Тамсама. – Арк. 6 – 6 адв., 7.

[3] Тамсама.

[4] Гарбачова, В.В. Удзельнікі паўстання 1830–1831 гг. на Беларусі: біябібліягр. слоўнік / В.В. Гарбачова. – Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2006. – С. 281.

[5] ДАБВ. – Ф. 2001. – Воп. 1. – Спр. 2083. – Арк. 72.

[6] ДАБВ. – Ф. 2003. – Воп. 1. – Спр. 319. – Арк. 2.

У перапісцы Столінскага павятовага староства з гміннымі ўправамі наконт неабходнасці ўпарадкавання могілак загінуўшых ёсць звесткі і пра пахаванні ўдзельнікаў паўстання 1863–1864 гг. У прыватнасці, пададзена інфармацыя пра паўстанцаў, якія ваявалі пад кіраўніцтвам уладальніка маёнтка ў в. Варані Адама Солтана. „Людзі гавораць, што паўстанцаў загінула шмат, хаця вядома толькі, дзе пахаваны 2 з іх – прозвішчы невядомы. Рускіх загінула 12, пахаваны ў лесе. Тэрыторыя, на якой пахаваны паўстанцы, належыць Карпу Гурману, што пражывае ў Рэчыцы"[7]. Аднак бібліятэкар Нацыянальнага музея ў г. Раперсвіль (Швейцарыя) Станіслаў Зялінскі яшчэ ў 1913 г. у польскамоўнай кнізе „Баі і сутычкі 1863–1864 гг." пісаў пра тое, што на полі боя каля в. Варані царскія войскі страцілі 19 забітых (сярод іх афіцэр – маёр Камер (магчыма, што гэта маёр Эміль Сігфрыдавіч фон Крэмер – *А.В.*), 4 унтэр-афіцэры, барабаншчык) і 17 параненых, а таксама прывёў прозвішчы 2-х загінуўшых паўстанцаў – Станіслаў Кулеша і Кжыньскі (сярод страт паўстанцаў названы яшчэ 1 паранены)[8]. На той час (1927 г.) ніякіх звестак аб іншых магілах паўстанцаў 1863–1864 гг. на тэрыторыі Столінскага павета не прыводзілася, у тым ліку і ў в. Калоднае, дзе адбыліся 2 сутычкі паўстанцаў пад кіраўніцтвам Р. Траўгута і Я. Ваньковіча. „У Радчыцку баёў не было. Толькі знаходзіцца магіла кіраўніка маёнтка Радчыцк, які загінуў як мучанік ад уласных сялян за ўдзел у паўстанні. Прозвішча невядома"[9]. Паводле Р. Гарашкевіча, у Варанях у баі 23 чэрвеня 1863 г. царскі маёр Камер (менавіта так пазначана яго прозвішча) быў паранены, страціў каля 50 чалавек забітымі і параненымі. Паўстанцы накіраваліся ў бок Калоднага, а потым Р. Траўгут праз усё Палессе дабіраўся да Варшавы. „І цяпер яшчэ ў ціхай шляхецкай вёсцы старыя відавочца тых падзей – Карповіч, Шаламіцкі ці Плотніцкі, разгаварыўшыся, раскажа абшырна і дэталёва аб тых часах. Як гэта ў Асавой ксёндз-пробашч і яўрэй-карчмар дапамагалі паўстанцам, якую святочную ноч наладзілі для групы ў лесе ў Асавой і Відзіборцы, як пан Солтан са Століна пайшоў да паўстанцаў і што з таго атрымалася і г.д."[10]. Неабходна дадаць, што ў міжваенны час да месцаў баёў паўстанцаў каля вёсак Варані і Калоднае Столінскага павета наладжваліся ўрачыстыя экскурсіі школьнай моладзі.

Падобныя акцыі ўшанавання падзей паўстання адбываліся і ў іншых мясцовасцях на Палессі. 7 студзеня 1933 г. кіраўнік пачатковай школы

---

7 Тамсама. – Арк. 13.

8 ДАБВ. – Ф. 2003. – Воп. 1. – Спр. 319. – Арк. 13–14.

9 Horoszkiewicz, R. Powiat Stoliński (notatki historyczne). – Brześć nad Bugiem, 1930. – S. 11.

10 ДАБВ. – Ф. 2001. – Воп. 1. – Спр. 2094. – Арк. 20.

ў Шаломічах Лемяшэвіцкай гміны Пінскага павета В. Дзержаноўскі, які з'яўляўся старшынёй будаўніцтва помніка паўстанцам 1863 г., звярнуўся да старасты Пінскага павета з адпаведным прашэннем. „Ніжэйшым ласкава просім Пана Старасту аб дазволе паставіць і асвяціць помнік паўстанцам 1863 г. на 70-ю гадавіну Студзеньскага паўстання – Антону Шаламіцкаму, Васілю і Сымону Калавурам, жыхарам той жа вёскі, якія прымалі актыўны ўдзел у паўстанні. Гістарычныя звесткі апісаны ў працах Рамана Гарашкевіча »Столінскі павет« і »Палессе«"[11]. Жыхары вёсак Шаломічы, Лозічы, Асавая і іншых былі абложаны вялікай кантрыбуцыяй за спачуванне і дапамогу паўстанцам[12]. Як пісаў Р. Гарашкевіч, сапраўды Антоній Шаламіцкі ўдзельнічаў у паўстанні 1863 г., за што быў пакараны царскімі ўладамі высылкай у Сібір. У канцы жыцця пасля вяртання з сібірскай высылкі ён памёр у пачатку XX ст. у Бродчы каля Плотніцы Столінскага павета, дзе знаходзілася яго магіла[13]. Як сведчыць уцалелае запрашэнне для старасты Пінскага павета, асвячэнне помніка ў вёсцы Шаломічы адбылося 22 студзеня 1933 г. у 10 гадзін пасля ранішняга богаслужэння. Былі таксама паказаны польскамоўныя прадстаўленні „X павільён" і „Польшча ў Віфлееме"[14].

У фондзе Брэсцкага акруговага ўпраўлення Саюза стральцоў утрымліваюцца завераныя копіі пратаколаў пасяджэнняў грамадскай камісіі (1928–1929 гг.), якая займалася ўшанаваннем памяці паўстанцаў 1863–1864 гг. на тэрыторыі Косаўскага павета Палескага ваяводства. Там таксама змешчаны акты асвячэння памятных крыжоў і помнікаў, пратаколы допытаў і апытанняў відавочнікаў падзей паўстання. Значная частка дакументаў прысвечана абставінам узнікнення помнікаў паўстанцам у ваколіцах мястэчка Косава і вёскі Ласасін[15]. Прыведзеныя ў тэксце ацэначныя сцвярджэнні пра паўстанне, яго кіраўнікоў і ўдзельнікаў адпавядалі тагачаснаму ўзроўню грамадскай думкі, гістарыяграфіі – паўстанне кваліфікавалася выключна польскім. Мерапрыемствы па мемарыялізацыі падзей паўстання актыўна выкарыстоўваліся польскімі

---

[11] Horoszkiewicz, R. Szlachta zaściankowa na ziemiach wschodnich / Polskie Towarzystwo Turystyczno-Krajoznawcze, Oddział Piński. – Wyd. 2. – Pińsk, 1937. – S. 27.

[12] *Horoszkiewicz, R. Spis rodów szlachty zaściankowej ziemi pińskiej. – Warszawa, 1937.* – S. 11.

[13] ДАБВ. – Ф. 2001. – Воп. 1. – Спр. 2094. – Арк. 29.

[14] У поўным аб'ёме крыніцы апублікаваны аўтарам дадзенага артыкула: Вабішчэвіч, А.М. Дакументальныя матэрыялы аб мемарыялізацыі падзей паўстання 1863–1864 гг. на тэрыторыі Косаўскага павета ў 1928–1930 гг. / Прадмова, каментарыі і пераклад з польскай мовы // Навукова-практычная канферэнцыя „Заходнебеларускі рэгіён у паўстанні 1863–1864 гг.: зборнік дакладаў, г. Пружаны, 12–13 красавіка 2013 г. – Брэст: Выд-ва БрДТУ, 2013. – С. 77–91.

[15] ДАБВ. – Ф. 364. – Воп. 1. – Спр. 22. – Арк. 13.

уладамі, грамадскімі арганізацыямі (Саюзам стральцоў у прыватнасці) у агульным рэчышчы ўзмацнення польскага ідэалагічнага ўплыву на заходнебеларускіх землях.

20 верасня 1928 г. у Мерачоўшчыне Косаўскага павета адбылося арганізацыйнае пасяджэнне камітэта будаўніцтва помніка паўстанцам 1863 г. у складзе старшыні, намесніка старасты Косаўскага павета Станіслава Рудніцкага, паручніка польскай арміі Алойзы Мораўца і інспектара гміннага самакіравання Косаўскага павета Геранімa Скжыньскага, на якім было вырашана звярнуцца да старасты Косаўскага павета Стэфана Чарноцкага стаць апекуном камітэта, а таксама пры дапамозе розных установаў і грамадскіх арганізацый неадкладна прыступіць да збору ахвяраванняў сярод насельніцтва для ўстаноўкі помнікаў на магілах паўстанцаў на могілках у мястэчку Косава і ў мясцовасці Ласасін[16]. У склад згаданага камітэта былі таксама ўключаны пасол польскага сейма Міхал Ваўжыкоўскі і рэдактар тыднёвіка „Polesie" (Брэст) Антоній Ганебах[17]. 17 жніўня 1929 г. камітэт быў перайменаваны ў секцыю пры кіраўніцтве акругі Стралецкага саюза ў Косаве па ўпарадкаванні магіл польскіх паўстанцаў, якія загінулі ў Косаўскім павеце ў змаганні з царызмам, і будаўніцтве ім помнікаў[18].

У ходзе падрыхтоўкі да ўстаноўкі помнікаў былі праведзены апытанні асобных старажылаў, яшчэ жывых тады відавочцаў паўстання. Цікавасць уяўляе пратакол апытання 76-гадовага жыхара Косава Міхала Кухты, запісаны 11 кастрычніка 1928 г. У прыведзеным ніжэй аб'ёмным урыўку выкладзены яго ўспаміны пра падзеі паўстання ў Косаве і наваколлі. „У час паўстання 10-гадовым хлопцам быў у хаце каля маці. Пра пачатак паўстання даведаўся ад Канстанцыі і Бенедзікты Цэнткоўскіх, дочак былога ў той час праваслаўнага папа Сцяпана Цэнткоўскага і матушкі Марылі. Усе ў названай сям'і Цэнткоўскіх былі палякамі-ўніятамі, асабліва матушка Марыля. У маі 1863 г., дзень дакладна не памятаю, даведаўся, што атрад паўстанцаў пад кіраўніцтвам Лукашэвіча, які налічваў 60 чалавек, стаіць у лесе Гарадзішча, размешчаным за 1 км на паўднёвы ўсход ад Косава. Даведаўся пра гэта таму, што дзяўчына Бенедзікта Цэнткоўская выслала мяне з лістком да п. [пана] Лукашэвіча і растлумачыла месца, дзе ён верагодней за ўсё размяшчаўся. У Косаве тады спыніўся расійскі прыстаў па прозвішчу Буш, які аднак быў авеяны польскім духам, як і усё Косава і ваколіцы. Я пабег з лістком і пасля

16 Тамсама. – Арк. 14.

17 Тамсама. – Арк. 17.

18 Фелікс Улодак (Шчасны) – землеўладальнік, кіраўнік пружанскага паўстанцкага атрада.

праходжання 3-х пікетаў заставў Лукашэвіча, які сядзеў каля століка ў лесе. Лісток аддаў і без здарэння вярнуўся з адказам. З таго часу пастаянна быў пасярэднікам паміж паўстанцамі і дзяўчатамі Цэнткоўскімі, насіў паўстанцам ежу, бялізну, навіны і розныя патрэбныя рэчы. Час ад часу прысылаў паўстанцам ежу і адзенне п. [пан] Астраменцкі Міхал, упаўнаважаны гр. [графа] Пуслоўскага ў Мерачоўшчыне. Гэта працягвалася 5 тыдняў, бо Лукашэвіч чакаў атрады пад кіраўніцтвам п. [паноў] Улодка[19] і Млотка[20] (імёнаў не памятаю) з Беластоку. Аднойчы, будучы ў настаўніка Главацкага, даведаўся, што 2 атрады, якіх чакалі з Беластоку, былі ўжо блізка. Начаваў тады ў настаўніка Главацкага. Пад раніцу Главацкі разам з 3-ма паўстанцамі з атрада Лукашэвіча падаўся ў Гарадзішча і разам з цэлым атрадам рушыў на Гулін. У той самы дзень каля 10 гадзін прыбылі да Мерачоўшчыны каля 300 казакаў, таму я адразу пабег з навінай да Гуліна і там ужо застаў разам усе 3 атрады, г. зн. Лукашэвіча, Улодка, Млотка. Адразу пасля паведамлення Лукашэвічу гэтай навіны ўсе 3 атрады пайшлі на Мілавіды. Калі вяртаўся, то сустрэў таксама за Косавам казакаў, якія паспяшаліся за паўстанцамі ў бок Івацэвічаў. Мяне затрымалі казакі і запыталі, адкуль вяртаюся і ці не бачыў паўстанцаў, на што адказаў, што шукаў згубленых авечак, а паўстанцаў нідзе не бачыў, то быў адпушчаны. Тры дні пасля вышэй апісанага выпадку даведаўся, што пад Мілавідамі на балотах паўстанцы ўступілі ў бой з расійскімі атрадамі, якіх ужо там тады падцягнулі больш, здаецца, што нават была артылерыя. На другі дзень вечарам у Косава з-пад Мілавідаў прывезлі 8 параненых паўстанцаў, сярод якіх быў Красінскі (імя не памятаю) з Альберціна, паранены ў бок і пасечаны па ўсім целе так, што не было свабоднага месца ад ранаў памерамі з далонь, што сам бачыў. Прысутнічаў пры тым, як Красінскі потым расказваў, што быў паранены і прыкінуўся забітым, калі набеглі казакі і адзін з іх стаў яму на жывот, а другі спрабаваў зняць з яго боты. Тады Красінскі не мог вытрымаць – цяжка ўздыхнуў, што пабачылі казакі і пачалі секчы шаблямі аж да страты прытомнасці. Памёр ад ранаў Красінскі крыху больш чым праз тыдзень і быў пахаваны ксяндзом Багдановічам на гарадскіх могілках за кошт узносаў мясцовых косаўскіх грамадзян.

Праз 7 тыдняў астатнія параненыя выздаравелі і былі адвезены ў Слонім. Не ведаю, што было з рэштай атрадаў Лукашэвіча, Улодка і Млотка, чуў толькі, што былі разбіты. Праз прыкладна 3 тыдні пасля боя пад Мілавідамі адбыўся большы бой у Бярозавым балоце паміж Гутай,

[19] Густаў Стравінскі (Млотак) – былы паручнік расійскай арміі, кіраўнік ваўкавыскага паўстанцкага атрада.

[20] ДАБВ. – Ф. 364. – Воп. 1. – Спр. 22. – Арк. 10–12.

Міхалін і Бялавічамі, каля 8 км ад Косава. Гэтаму бою папярэднічалі меншыя баі і дробныя сутычкі ў ваколіцах каля 3 км на паўднёвы ўсход ад Косава, адкуль аднак параненых не прывозілі, бо ў асноўным былі дабіты на месцы казакамі. Пры гэтым памятаю, што ў пэўным месцы паўстанцы пры пераходзе праз дарогу Косава-Няхачава прайшлі тылам наперад, чым збліталі казакаў. Праз некалькі дзён пасля гэтага факта і шэрагу баёў у вышэй згаданых месцах адбыўся большы бой на Бярозавым балоце, у час якога кіраўнік атрада паўстанцаў Лукашэвіч, але не той, пра якога гаварылі раней, а які змагаўся пад Мілавідамі, быў паранены ў жывот і ўпаў у кусты. На ляжачага натыкнуўся расійскі салдат Скотніцкі (імя не памятаю) і закалоў штыком насмерць. Труп Лукашэвіча быў прывезены, здаецца, лесніком Грэцкім, які расказваў пазней, што сам чуў, як закалолі Лукашэвіча, і паказваў месца здарэння”[21].

Паводле слоў апытанага старога, Лукашэвіч быў пахаваны патаемна на гарадскіх могілках у Косаве намаганнямі арганіста Юзэфа Цясельскага. Ён таксама засведчыў, што быў прывезены і пахаваны труп яшчэ аднаго паўстанца з невядомым прозвішчам.

Апытанне М. Кухты праводзілася для высвятлення месцазнаходжання магіл паўстанцаў. „Магіла Красінскага знаходзіцца на каталіцкіх могілках пры іх паўднёва-ўсходнім баку на адлегласці каля 3,5 м на паўднёвы ўсход ад вялікага дуба і драўлянага крыжа, каля 2,5 м ад бярозы, што стаіць каля самага плоту, – паведаміў ён. – Магіла Лукашэвіча знаходзіцца каля 1 м на паўднёвы захад ад папярэдняй, а магіла паўстанца невядомага прозвішча – 1 м на паўднёвы захад ад магілы Лукашэвіча. На магіле Красінскага быў пастаўлены крыж у рост чалавека, а на іншых магілах няма”. Пры гэтым было пацверджана, што пахаванні ніколі не былі парушаны[22].

Пасля гэтага 29 кастрычніка 1928 г. быў складзены пратакол паказанняў пошуку магіл 3-х польскіх паўстанцаў, якія загінулі ў 1863 г. у Косаўскім павеце і пахаваны на каталіцкіх могілках – Красінскага, Лукашэвіча і невядомага па прозвішчу. Акрамя мясцовых жыхароў – ужо згаданага Міхала Кухты і 52-гадовага Пятра Зукоўскага – прысутнічалі кіраўнік камітэта па ўпарадкаванні магіл паўстанцаў 1863 г., намеснік косаўскага старасты Станіслаў Рудніцкі і бурмістр горада Косава Баляслаў Маліноўскі. Аднак адшукаць пахаванні паўстанцаў на могілках аказалася няпроста. „Пасля працяглага пошуку на мясцовасці прыйшлі мы да пераканання і сцвярджаем, што магілы вышэй згаданых загінуўшых герояў знаходзяцца каля магілы каталіцкага ксяндза, пахаванага ў 1858 годзе, а не ў месцы папярэдне памылкова ўказаным адным са знаёмых

[21] Тамсама.

[22] Тамсама. – Арк. 9.

Міхала Кухты, які тады не ўлічыў, што могілкі каля 35 гадоў таму назад былі пашыраны"[23].

Нарэшце 11 лістапада 1928 г. на каталіцкіх могілках у Косаве адбылося адкрыццё і асвячэнне помніка загінуўшым паўстанцам 1863 г. Прысутнічалі прадстаўнікі дзяржаўных улад, органаў самакіравання, вайскоўцы, члены гарадскога сейміка. „Помнік як сімвал любові да Бацькаўшчыны з нагоды 10-й гадавіны незалежнасці Польшчы ўзводзіцца польскім героям паўстання 1863 года – Красінскаму, Лукашэвічу і з невядомым прозвішчам, якія на зямлі Палесся 60 гадоў назад палажылі ў ахвяру Бацькаўшчыне свае маладыя жыцці, імкнучыся атрымаць незалежнасць"[24]. Акт асвячэння правёў мясцовы ксёндз-дэкан Фелікс Драздоўскі.

Ушанаванне памяці ўдзельнікаў паўстання 1863–1864 гг. не абмежавалася ўстаноўкай толькі гэтага помніка. На пасяджэнні грамадскага камітэта па ўпарадкаванні магіл паўстанцаў 10 снежня 1928 г. было вырашана наступнае: „1. Так як Косаўскі павет мае важнае гістарычнае значэнне для Польскай дзяржавы як калыска кіраўніка Тадэвуша Касцюшкі, ...трэба любыя дзеянні польскіх паўстанцаў, народных паўстанняў і т. п. замацаваць у выглядзе помнікаў, памятных дошак і іншага, што будзе мець апрача ўсяго важнае выхаваўча-маральнае значэнне для народа і польскасці тут, на крэсах, таму пры першай магчымасці паставіць памятныя крыжы ў месцах, дзе былі баі ці сутычкі паўстанцаў з захопнікам, а месцамі тымі з'яўляюцца ваколіцы Косава і Ласасіна Косаўскага павета. 2. Калі адмерзне зямля, таксама неабходна паставіць на фундамент помнік на магіле 40 польскіх паўстанцаў, што ляжыць на палях Ласасіна – помнік, які ўжо зроблены і знаходзіцца на захаванні ў Ружанскай гміне. 3. Пастаўлены ўжо камітэтам 11 XI 1928 г. на каталіцкіх могілках у Косаве помнік на магіле 3-х польскіх паўстанцаў, што загінулі ў 1863 г., з надыходам вясны трэба абгарадзіць. 4. Упаўнаважыць старшыню камітэта п. [пана] Рудніцкага ўрэгуляваць рахункі і наяўнасць за выкананне помнікаў і памятных крыжоў, а таксама агароджаў, звязаных з акцыяй, што распачалася выконвацца камітэтам. 5. Памятны крыж побач з Косавам трэба паставіць на гадавіну паўстання, г. зн. 22 ці 23 студзеня 1929 года"[25].

Намаганнямі дадзенага грамадскага камітэта былі ўстаноўлены за кошт добраахвотных узносаў памятныя крыжы і помнікі. Так, 23 студзеня 1929 г. на адлегласці каля 3 км ад Косава, пры дарозе з мястэчка да чыгуначнай станцыі Косава-Палескае, тым жа ксёндзом-дэканам Феліксам

[23] Тамсама. – Арк. 3–5.

[24] Тамсама. – Арк. 15.

[25] Тамсама. – Арк. 24, 1–2.

Драздоўскім быў асвечаны памятны крыж з польскамоўным надпісам „W tych okolicach miały miejsce potyczki powstańców polskich z najeźdźcą w 1863 roku" („У гэтых ваколіцах былі сутычкі польскіх паўстанцаў з захопнікам у 1863 годзе"). Прысутнічалі прадстаўнікі дзяржаўных улад, органаў самакіравання і вайскоўцы. „Крыж як сімвал любові да Бацькаўшчыны ўзводзіцца з нагоды 66-й гадавіны Студзеньскага паўстання ў месцы, дзе былі сутычкі польскіх герояў паўстання 1863 г. з расійскім захопнікам"[26]. А 26 мая 1929 г. на адлегласці каля 2 км ад асады Шчытна Ружанскай гміны Косаўскага павета побач з дарогай Шчытна-Бярозаўка ў прысутнасці прадстаўнікоў дзяржаўных улад, органаў самакіравання і вайскоўцаў быў асвечаны мемарыяльны помнік з надпісам „Prochom 40 powstańców polskich poległych w 1863 roku w walkach z najeźdźcą – mieszkańcy powiatu" („Праху 40 польскіх паўстанцаў, якія загінулі ў змаганні з захопнікам – жыхары павета"). „Помнік ўзводзіцца на магіле 40 польскіх герояў паўстання 1863 года, якія загінулі ў змаганні з расійскім захопнікам на палях Шчытна і Ласасіна"[27]. Акт асвячэння правёў ксёндз-пробашч рымска-каталіцкай парафіі ў Ружанах Альбін Ройша.

Заслугоўваюць увагі вучоных, краязнаўцаў і змястоўныя інфармацыйныя паведамленні каменданта пастарунка польскай дзяржаўнай паліцыі ў Шчытне Косаўскага павета Станіслава Посьпеха (1929 г.). „На мяжы земляў, якія з аднаго боку належалі жыхарам вёскі Шчытна, з другога боку – жыхарам вёскі Ласасін, ва ўрочышчы Церцежа, на адлегласці 2,5 км ад асады Шчытна, 200 метраў ад гасцінца, г. зв. Шчыцянкі (стары тракт Слонім-Пружаны), знаходзіцца магіла паўстанца 1863 г. Гэтая магіла вясной 1928 г. была абгароджана, пастаўлены крыж. На крыжы зроблены надпіс »Тут пахаваны польскія паўстанцы, якія загінулі ў змаганні з захопнікам у 1863 г. за нашу і вашу свабоду«. Унізе надпіс »Пашана іх памяці«. З боку гасцінца магіла засланяецца дрэвамі, так што слаба бачная. Колькасць асоб, пахаваных у магіле, нельга дакладна ўстанавіць. Найбольш зручна даехаць да магілы па гасцінцы"[28].

Адносна гэтай брацкай магілы паўстанцаў 1863 г. распытаны камендантам жыхар асады Курылаўка Юзэф Шабуня паказаў наступнае: „Польскае паўстанне 1863 г. памятаю, быў тады хлопцам 14–15 гадоў і жыў ў асадзе Шчытна, дзе цяпер знаходзіцца пастарунак паліцыі. Памятаю польскіх паўстанцаў, гэта было ніякае не рэгулярнае войска, а былі гэта грамадзянскія людзі, па-рознаму апранутыя і ўзброеныя. Са зброі мелі г. зв.

[26] Тамсама. – Арк. 6–8.

[27] Тамсама. – Арк. 16.

[28] Тамсама.

крэмянёўкі, а некаторыя мелі пісталеты, што тады называлі »штуцэрамі«. Часта таксама прыходзіла тады расійскае войска, кавалерыя, і распытвала пра палякаў, бо тыя знаходзіліся тут у навакольных лясах, якія тады былі вельмі вялікімі і шырока раскінутымі. Аднаго разу завязалася тут у гэтых лясах бойка паміж палякамі і расійскімі войскамі. Мне здаецца, што гэта былі казакі. Бой працягваўся некалькі гадзін, а стрэлы былі ў нас добра чутнымі. На тым месцы, дзе зараз яшчэ відаць магіла, было шмат польскіх трупаў, якіх пахавалі ў адной агульнай магіле, кладучы адзін на другога. Забітых тады было больш 50, хаця не ўсе засталіся ў той магіле, таму што пэўную частку сваякі забітых аднойчы ноччу пазабіралі, так што ў магіле маглі застацца каля 40. Збоку магілы знаходзілася сасна, на якой было выразана, колькі і каго там пахавалі. Пазней хтосьці спілаваў тую сасну”[29].

Наконт раскіданых у лясной мясцовасці магіл паўстанцаў 1863 г. быў распытаны і 74-гадовы праваслаўны селянін вёскі Клепачы Ружанскай гміны Касаўскага павета Іван Лявонавіч Маразевіч. „Маладым хлопцам служыў у Манцэвіча, які быў ляснічым у дзяржаўным лесе – у Ружанскай пушчы – і жыў у тым месцы, дзе зараз знаходзіцца леснічоўка Бярозаўка. Манцэвіч быў палякам. Манцэвіч любіў паляваць і я часта хадзіў з ім у лес. Памятаю, што пры дарозе, якая ідзе праз Ружанскую пушчу з м [ястэчка] Ружаны да Пружан, г. зн. пры шашы і палявой дарозе, знаходзілася магіла, на якой быў крыж. Не раз бачыў, што Манцэвіч даглядаў гэтую магілу, што мяне зацікавіла, таму пытаў Манцэвіча, хто ляжыць у той магіле. Манцэвіч расказваў мне, што тут ляжаць польскія паўстанцы, забітыя казакамі ў час паўстання. Таксама мне паведаміў, што дубальтоўка, якую мае, належала аднаму паўстанцу, які пахаваны ў гэтай магіле. Як дастаў ён гэтую дубальтоўку, пра гэта не пытаў. Манцэвіч расказваў мне, што тыя паўстанцы заблудзіліся ў лесе, уцякаючы пасля нападу на іх казакаў пад Шчытнам і Ласасінам, і замест абозу, які знаходзіўся ў ваколіцы Яніна Лыскаўскай гміны, прыбылі сюды, іх казакі злавілі і забілі. Паводле Манцэвіча, паўстанцаў было 2 ці 3. Апошні раз гэтае месца наведваў перад сусветнай вайной і бачыў, што крыж яшчэ быў, хаця ўжо зусім спарахнелы. А магіла зарасла травой і асела, г. зн. зраўнялася з зямлёй. Паколькі зараз на гэтым месцы знаходзіцца лес, мог бы гэтае месца знайсці. Было гэта на адлегласці менш-больш 1 км ад Бярозаўкі ў напрамку Ружан. Пра іншыя магілы, акрамя магілы, на якой у б. г. [бягучым годзе] быў пастаўлены помнік у ваколіцы Ласасіна, не чуў, хаця ў гэтых лясах амаль 30 гадоў быў леснікам”[30].

---

[29] Тамсама.

[30] Тамсама. – Арк. 20.

Пасля праведзенага расследавання той жа камендант пастарунка дзяржаўнай паліцыі ў Шчытне Ст. Посьпех прадставіў 8 жніўня 1929 г. павятоваму старасце ў Косаве справаздачу аб магіле паўстанцаў. „Дзеля выканання ўказання ад 11 VII 29 г. па сутнасці справы заяўляю, што нягледзячы на энергічныя апытанні ў ваколіцах Ласасіна не пацверджана больш ніякай магілы паўстанцаў 1863 года. А апытанні паказалі, што ў Ружанскай пушчы, побач з леснічоўкай Бярозаўка, на ўзроўні 21 км шашы Ружаны-Пружаны, у паўкіламетры ад шашы, пры старым гасцінцы Ружаны-Смаляніца павінна знаходзіцца магіла 2 ці 3 паўстанцаў. Пра акалічнасці гэтага быў дапытаны Маразевіч Іван, што пражывае ў Клепачах. Апытаннямі жыхароў бліжэйшых хутароў Пружанскага і Ваўкавыскага паветаў пацвердзіў, што паказанне Маразевіча Івана можна лічыць праўдзівым, бо старэйшыя людзі гэтых хутароў памятаюць у месцы, указаным Маразевічам, магілу з крыжом, хаця таго месца ніхто зараз паказаць не можа. А беручы пад увагу распалажэнне дарог, магчымым з'яўляецца тое, што згаданыя паўстанцы, разбітыя часткі атрада з-пад Шчытна і Ласасіна, хацелі прабрацца пад Янін, дзе паводле інфармацыі павінен знаходзіцца абоз паўстанцаў, маглі заблудзіцца і натыкнуліся на казакаў. Маразевіч Іван гаворыць, што паколькі на гэтым месцы яшчэ ёсць лес, то ён мог бы тое месца знайсці. Заяўляю, што Маразевічу 74 гады і пешшу не можа адправіцца, бо тое месца аддалена ад вёскі Клепачы больш чым на 20 км”[31].

Месца пахавання паўстанцаў 1863 г. у лесе каля леснічоўкі Бярозаўка ўсё-такі было агледжана з удзелам жыхара вёскі Клепачы Івана Маразевіча, пра што сведчыць пратакол, складзены 1 верасня 1929 г. прыбыўшым з ім войтам Ружанскай гміны Мікалаем Макарэвічам. „Пры гэтым на месцы высветліў, што пра існаванне магілы сведчаць 2 увагнутасці зямлі, адна ўвагнутасць ад пахаваных там прахаў, а другая ад крыжа, які не знойдзены. Гэтае месца было абсыпана зямлёй і на магіле ўбіта адпаведная паля. Пры капанні зямлі натыкнуліся на косці, якія былі складзены ў магілу. Вышэй узгаданая магіла знаходзіцца на ўзроўні 21 км шашы, што праходзіць з Ружан да Пружан, у баку леснічоўкі Бярозаўка (1 км ад шашы)”[32].

Гэтае месца пахавання паўстанцаў было добраўпарадкавана. Да 67-й гадавіны Студзеньскага паўстання было прымеркавана ўрачыстае асвячэнне пастаўленага там крыжа ў прысутнасці прадстаўнікоў дзяржаўных улад, органаў самакіравання і вайскоўцаў. 26 студзеня 1930 г. каля 21 км шашы, што праходзіць з Ружан да Пружан, пры леснічоўцы Бярозаўка, у 1 км ад шашы Ружанскай гміны ксёндз-пробашч рымска-

---

[31] Тамсама. – Арк. 18.

[32] Тамсама. – Арк. 19.

каталіцкай парафіі ў Ружанах Альбін Ройша асвяціў памятны крыж з надпісам »Тут пакояцца 2 невядомыя па прозвішчу польскія паўстанцы, якія загінулі ў 1863 г. у змаганні з захопнікам«. Крыж быў пастаўлены на магіле 2-х польскіх герояў паўстання 1863 года, невядомых па прозвішчах, якія загінулі ў змаганні з расійскім захопнікам пры абароне"[33].

У цэлым, акрэсленыя дакументальныя матэрыялы аб ушанаванні памяці паўстанцаў 1830–1831 і 1863–1864 гг. на Палессі, пошуку іх пахаванняў, устаноўцы помнікаў і крыжоў ў 1920–30-я , якія захоўваюцца ў розных фондах Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці, з'яўляюцца каштоўнымі крыніцамі па лакальнай гісторыі і гістарычным краязнаўстве. У сучасных умовах яны дазваляюць правесці верыфікацыю падзей гэтых паўстанняў у канкрэтных мясцовасцях Брэсцкай вобласці, а таксама паспрыяць добраўпарадкаванню ўцалелых і аднаўленню занядбаных ці зніклых пахаванняў паўстанцаў.

---

ALEKSANDER WABISZCZEWICZ, Dokumenty Archiwum Państwowego Obwodu Brzeskiego z lat 1920–1930 dotyczące upamiętnienia powstania 1830–1831 r. i powstania 1863–1864 r. na Polesiu

W artykule autor dokonuje przeglądu i analizy materiałów archiwalnych, przechowywanych w archiwum w Brześciu, dotyczących obchodów na Polesiu w latach 20. i 30. XX w. powstania listopadowego i powstania styczniowego. Zostały omówione inicjatywy władz i organizacji społecznych na obszarze powiatów stolińskiego, kosowskiego i pińskiego województwa poleskiego poszukiwania miejsc pochówku powstańców, stawiania krzyży i pomników na mogiłach. W konkluzji autor stwierdza, iż materiały te mogą być wykorzystane do weryfikacji dziejów przebiegu powstania styczniowego.

[33] Тамсама. - Арк. 22–23.